Цана 10 кап. (грош.)

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Орган Часовага Упраўлення гор. Вільно

ВІЛЕНСКАЯ ПРАЎДА

№ 11
4 кастрычніка 1939 г.
Серада

Наладзіць бесперабойны гандаль

Горад Вільно з'яўляецца адным з самых буйных гарадоў Заходняй Беларусі. У ім сканцэнтраваны цэлы рад прадпрыемстваў, чыгуначны вузел, рад навучальных устаноў, як універсітэт, гімназіі і т. д. Па гэтаму, пытанне забеспячэння насельніцтва горада сельска-гаспадарчымі прадуктамі і прамысловымі таварамі набывае асабліва важнае значэнне.

Бяздарныя і неразумныя польскія правіцелі не клапаціліся аб забеспячэнні нармальнага снабжэння жыхароў горада. Ужо з першых дзён германа-польскай вайны забеспячэнне насельніцтва значна пагоршылася. Падвоз прадуктаў і прамысловых тавараў спыніўся, а старыя, вельмі нязначныя запасы, прыходзілі к канцу.

Народ таржаствуе перамогу, лікуе. Ен упэўнен, што з прыходам Чырвонай Арміі скіне з сябе аковы рабства, жабрацтва і бяспраўя. У саюзе з народамі вялікай краіны соцыялізма ён сваімі ўласнымі рукамі будзе будаваць радаснае і шчаслівае жыццё.

Часовае Упраўленне г. Вільно, створанае ў першыя-ж дні прыхода Чырвонай Арміі, прыняло ўсе меры к таму, каб наладзіць нармальнае жыццё горада. Часовае Упраўленне абнародавала палажэнне аб тым, што адначасова з совецкімі грашыма маюць ход і польскія злотыя. У сваёй пастанове Часовае Упраўленне указвае аб недапушчэнні павышэння цэн.

Між тым назіраецца, што рад прыватных гандляроў і гандлёвых арганізацый дапускаюць незаконнае павышэнне цэн. Так, уладар вялікага магазіна гатовай вопраткі Хановіч (на Німецкай вул.) прадаваў вопратку па 150 руб. у той час, як раней гэты-ж камплет каштаваў 50 рублёў.

Мануфактурныя магазіны, па той-жа вуліцы, Гардона і Рэмігольскага прадавалі тавары, каштоўнасць якіх 2 руб. 40 кап. за метр,—па 10 руб. Абутковы магазін „Безет" прадаваў туфлі каштоўнасцю ў 20 руб. па 40 і нават больш.

Такіх прыкладаў можна прывесці шмат. Яшчэ горш абстаіць справа ў вялікіх магазінах сукна.

У Вільно налічваецца больш 1500 лавак. Многія ўладальнікі магазінамі з прыходам Чырвонай Арміі спынілі адкрыты гандаль у магазінах, не жадаючы прадаваць тавары па нармальных цэнах, узмоцнена заняліся спекуляцыяй, продажам тавараў з-пад палы, з закрытых памяшканняў, ствараючы гэтым самым абстаноўку ажыятажа. Такія паводзіны накіраваны супраць інтарэсаў працоўных мас. Часовае Упраўленне ў сваёй пастанове папярэдзіла ўсіх уладароў магазінаў аб тым, каб быў забяспечан нармальны гандаль як прадуктамі харчавання, так і прамысловымі вырабамі. Як відаць, не ўсе ўласнікі магазінаў зрабілі для сябе неабходныя вывады. Патрэбна папярэдзіць усіх уласнікаў гандлёвых прадпрыемстваў, што ў выпадку, калі яны з указанняў Часовага Упраўлення не зробяць неабходных практычных вывадаў, то мясцовыя органы ўлады знайдуць сродкі каб заставіць іх уважаць мерапрыемствы, накіраваныя ў інтарэсах працоўных.

У апошнія дні намеціўся некаторы пералом у адносінах забеспячэння насельніцтва сельска-гаспадарчымі прадуктамі. Значна павысіўся прыток сельска-гаспадарчых прадуктаў з вёскі, што стварае больш нармальнае жыццё насельніцтва горада. Павялічыўся прыток малака з вёсак, 2 кастрычніка на бойню паступіла больш 100 галоў жывёлы. Часовым Упраўленнем разасланы людзі ў вёскі для закупкі прадуктаў. Часовым Упраўленнем прымаюцца меры таксама к больш чоткаму упарадкаванню гандлю прамысловымі вырабамі.

Днямі ў горад прыбудзе першая партыя дроў, якія будуць прадавацца насельніцтву.

Але гэта толькі пачатак вялікай, сур'ёзнай і крапатлівай работы, паспяховае правядзенне якой патрабуе вялікай і адданай работы ўсіх працоўных мас.

Грамадскія і рабочыя арганізацыі, рабочая гвардыя павінны дапамагчы мясцовым органам улады забяспечыць нармальную работу ўсёй гандлёвай сеткі.

Няма сумнення ў тым, што насельніцтва горада Вільно і грамадскія арганізацыі дапамогуць Часоваму Упраўленню ў арганізацыі нармальнага і чэснага гандлю, не дадуць магчымасці асобным элементам, карыстаючыся пераходным перыядам, нажывацца на чэснай працы працоўных.

На будаўніцтве Дварца Советаў

МАСКВА, 3 кастрычніка (ТАСС). Напружана працуе калектыў будаўнікоў Дварца Советаў, пачаўшы новы адказны этап ў пабудове гігантскага будынку — мантаж каштоўнага фасада. Сотні архітэктараў, мастакоў, канструктараў рашаюць у майстэрнях і лабараторыях важнейшыя праблемы афармлення Дварца. Інжынеры і тэхнікі праектнай майстэрні заканчваюць і здаюць будаўнікам тэхнічны праект. У санітарна-тэхнічным аддзеле правяраюцца спосабы захавання ад замярзання вокан Дварца, кожнае з якіх будзе мець да 15 метраў вышыні.

... Вакол фундамента цэнтральнай часці будынку высіцца 8 сорakметровых кранаў-дэррыкаў. З іх дапамогай уложана 25 масіўных металічных башмакоў і 64, на якіх будуць устаноўлены велізарныя калоны. 15 башмакоў ужо заклёпана, кожны з іх патрабаваў звыш 1000 заклёпаў. Пачаўся монтаж асноў для калон у другой часці будынку, выходзячай на Вальхонку. Тут башмакі заменены спецыяльна крэпленымі талравымі балкамі-росверкамі з уложанымі на іх металічнымі лістамі-слябамі. Адсюль, з боку Вальхонкі, пачнецца ў бліжэйшым часе монтаж стальных калон. Праз некалькі месяцаў яны паднімуцца над будаўнічай пляцоўкай на дзесяткі метраў.

Магутны вугальны перагружацель

Магутны маставы вугальны перагружацель згатовіў ленінградскі завод пад'ёмна-транспартнага абарудвання імені С. М. Кірава. Вытворчасць разлічана на перагрузку 150 тон вугалю ў гадзіну. На заводзе канстатуіруецца новы гіганцкі перагружацель магутнасцю да 600 тон вугалю ў гадзіну.

Паседжанне лермантаўскага юбілейнага камітэта

3 кастрычніка у Саюзе совецкіх пісьменнікаў адбылося паседжанне лермантаўскага юбілейнага камітэта. Абгаварваліся мерапрыемствы па падрыхтоўцы да 125-годдзя са дня нараджэння вялікага рускага паэта. Святкаванне гэтага знамянацельнага юбілея прыме шырокі размах. У радзе рэспублік і гарадоў краіны створаны юбілейныя камітэты. Арганізуюцца літаратурныя вечары на прадпрыемствах, у бібліятэках, вузах і школах праводзяцца лекцыі і даклады. Творы Лермантава перакладаюцца на дзевяць нацыянальных моў, у тым ліку на калмыцкую, марыйскую і заданскую. У Маскве арганізуецца выстаўка літаратурнага музея „Жыццё і творчасць М. Ю. Лермантава" і рад іншых мерапрыемстваў. Выдавецтвы выпусцяць к юбілею творы Лермантава. У дзень юбілея 15 кастрычніка з Калоннага зала Дома саюзаў будзе трансліравацца па радыё на ўвесь Саюз урачыстае паседжанне.

(ТАСС)

Калгаснае рыбалоўства

У калгасных вадаёмах Татарыі пачалося вылаўліванне зеркальнага карпа. У гэтым годзе ў 62 калгасах Рэспублікі было зарыблена карпам 364 гектары калгасных прудоў.

Падрыхтоўка сельскагаспадарчых кадраў

У Сталінградскай вобласці пачалі работаць 7 механізатарскіх школ, 19 міжраённых калгасных школ і розныя курсы, рыхтуючыя трактарыстаў, камбайнераў, механікаў і другіх кваліфікаваных работнікаў сельскай гаспадаркі. На падрыхтоўку кадраў асігнавана больш 10 мільёнаў рублёў.



Група Рабочых Гвардзейцаў I-га батальёна г. Вільно, — слухаюць даклад політрука тав. І. Р. Басалыго аб задачах Рабочай Гвардыі.

фота Сапіра.

Тэлеграма з Калымы

„Віленскай Праўдзе"

Калектыву рэдакцыі „Віленская Праўда" і ўсім чытачам маладой брацкай газеты, вызваленаму ад векавога гнёта польскіх паноў, ад гэтага часу свабоднаму і шчасліваму народу шлём мы брацкае большэвіцкае прывітанне з далёкай прыпалярнай совецкай акраіны — Калымы.

Сярод сопак тайгі совецкія людзі, перамагаючы суровую паўночную прыроду працуюць як і увесь наш народ на карысць Соцыялістычнай Радзімы і ўсяго працоўнага чалавецтва. Будаўнікі далекай паўночы з хваляваннем і радасцю слухаюць па радыё весткі аб першых рэволюцыйных мерапрыемствах брацкага народа вызваленай Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Горача паціскаем вам рукі. Жадаем паспяхова змагацца на карысць беларускага народа у дружнай сям'і народаў Саюза ССР.

Няхай жыве Беларусь!

Работнікі рэдакцыі газеты „Советская Калыма", нацыянальнай газеты на орочельскай мове „Ороччы правда", навукова-тэхнічнага грамадска-палітычнага журнала „Колыма".

Друкарня галоўнага упраўлення горада Магадан.

Комуністы ішлі ў бой у першых радах

Наша Чырвоная Армія выканала загад Галоўнага камандавання. Мы вызвалілі нашых братоў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Замучаныя польскімі панамі працоўныя Заходняй Беларусі сустракаюць байцоў Чырвонай Арміі, як сваіх блізкіх, як сваю верную абарону.

Увесь шлях па тэрыторыі Заходняй Беларусі аж да горада Вільно мы праходзілі праз сёлы, упрыгожаныя чырвонымі сцягамі, на хатах былі лозунгі: «Дзякуем таварышу Сталіну за наша вызваленне», «Брацкае прывітанне Чырвонай Арміі». Дзяўчаты дарылі чырвонаармейцам букеты кветак. Гэтыя дні сталі для народа ўсеагульным радасным святам.

Чырвоная Армія перамагае таму, што кіраўніком тыла і фронта з'яўляецца Партыя Большэвікоў.

Нашы комуністы ва ўсіх ваенных аперацыях паказалі сябе, як гераічныя і верныя сыны нашай вялікай соцыялістычнай радзімы.

Члены партбюро таварыш Ткачэнка і таварыш Маскоў першымі захапілі ў свае рукі ў горадзе Вільна склады зброі, яны, рызыкуючы сваім жыццём, папярэдзілі падрыхтаваныя польскімі афіцэрамі выбухі.

Намеснік сакратара палкавога бюро таварыш Коласаў з 40 чырвонаармейцамі заняў пасажырскі вакзал, захапіўшы 6 станкавых кулямётаў, 800 вінтовак і 250 чалавек палонных. У гэту ноч, засеўшыя ў падвале польскія афіцэры, абстрэльвалі з кулемётаў атрад таварыша Коласава, але ніхто не змог запалохаць большэвіка-камандзіра і яго атрад. За гэту ноч было ліквідавана афіцэрскае гняздо.

Члены партыйнага бюро таварыш Ермакоў і Маскоў правадзілі вялізарную работу па арганізацыі ў горадзе Вільна Рабочай Гвардыі.

З 15 верасня паступіла 25 заяў аб прыёме ў рады партыі Леніна—Сталіна. Камандзір батарэі таварыш Чэрнікоў зайшоў ў памяшканне партыйнага бюро і заявіў: «Прашу прыняць мяне ў рады Комуністычнай партыі, не хачу ісці ў бой беспартыйным». Кандыдат ВКП(б) таварыш Колышаў у сваей заяве піша: «Хачу быць у баю членам ВКП(б)». Таварыш Дзмітраў заяўляе: «Прашу партарганізацыю прыняць мяне ў кандыдаты ВКП(б). Я абавязваюся працаваць так, каб апраўдаць гэта высокае званне і не пашкадую, калі гэта будзе патрэбным за Радзіму аддаць жыццё».

Комуністы вядуць вялікую работу сярод чырвонаармейцаў і таму ў нас усе звенні работы прапітаны баявой задачай, пастаўленай перад намі камандаваннем.

Сакратар партбюро Юркоў.

Работнікі мастацтва БССР працоўным Заходняй Беларусі

Работнікі мастацтва Беларускай ССР з вялізарным натхненем едуць ў госці да сваіх братоў-працоўных Заходняй Беларусі, каб пазнаёміць іх з узорамі выдатнага соцыялістычнага мастацтва.

Ў Заходняй Беларусі з выключным поспехам выступаюць калектывы і канцэртныя брыгады БССР. Ужо далі рад канцэртаў і прадаўжаюць выступаць ансамбль беларускай песні і пляскі, аркестр народных інструментаў Мінскай Філармоніі, брыгада артыстаў Вялікага Тэатра оперы і балета БССР на чале з народнай артысткай БССР Л. Александроўскай, тры брыгады беларускай эстрады і брыгада мінскай кансерваторыі.

Асабліва горача сустракаюць слухачы выступлення ансамбля Беларускай Асобай Ваеннай Акругі.

2 кастрычніка ў Заходнюю Беларусь выехаў калгасны тэатр, які з паспехам выступаў нядаўна ў Маскве на Ўсесаюзнай Алімпіядзе калгасных тэатраў. На працягу месяца тэатр зробіць паездку па маршруту Маладэчна—Ашмяны Свенцяны—Глыбокае—Дзісна. Па маршруту Пінск—Кобрын выязджае калектыў Мозырскага драматычнага тэатра.

У апошнюю мінуту

Прыбыццё ў Маскву міністра замежных спраў Літвы П. І. Урбшыса

3 кастрычніка гэтага года ў Маскву прыбыў міністр замежных спраў Літвы п. Урбшыс у суправаджэнні чрэзвычайнага пасланіка і паўнамоцнага міністра Літвы п. Наткевічыўса і асабістага сакратара міністра п. Свелнікаса. Адначасова з міністрам прыбылі паверaны ў справах СССР у Літве таварыш Н. Г. Позднякоў і торгпрэд СССР у Літве таварыш С. А. Ефанаў.

На цэнтральным аэрапорце п. Урбшыса сустрэлі нам. народнага камісара замежных спраў тав. С. А. Лазоўскі, нам. народнага камісара знешняга гандлю тав. М. С. Сцепанаў, нам. старшыні мосовета тав. М. А. Ясноў, загадчык пратакольнага аддзела НКЗС тав. В. Н. Баркоў, загадчык аддзела прыбалтыйскіх краін тав. А. П. Васюкоў, камендант горада Масквы комбрыг тав. В. А. Рэвякін, в. а. начальніка аддз. дагавораў наркомзнешгандлю тав. Д. Д. Мішусцін, увесь састаў літоўскай місіі ў Маскве на чале з паверaным у справах п. Багдонасам, саветнік эстонскай місіі п. Оянсон, першы сакратар латвійскай місіі п. Альберт.

Цэнтральны аэрапорт быў упрыгожан совецкімі і літоўскімі флагамі.

Прыём міністра замежных спраў Літвы п. Урбшыс таварышам Молатавым.

3 кастрычніка г. г. вечарам адбылася гутарка таварыша Молатава з міністрам замежных спраў Літвы п. Урбшыс.

У гутарцы прынялі ўдзел таварышы Сталін, Пацёмкін, павераны ў справах СССР у Літве тав. Позднякоў, а таксама літоўскі пасланнік ў Маскве п. Наткевічыус.

Гутарка прадаўжалася звыш 2 гадзін.

Прэзідэнт Эстонскай Рэспублікі ратыфіцыраваў савецка-эстонскі пакт аб узаемадапамозе

ТАЛІН, 3 кастрычніка. (ТАСС). Эстонскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе, што прэзідэнт Эстонскай Рэспублікі ратыфіцыраваў пакт аб узаемадапамозе паміж СССР і Эстоніяй.

На фабрыцы „Электрыт“

Фабрыка радыёапаратуры і радыёпрыёмнікаў „Электрыт“ — самае вялікае прадпрыемства ў горадзе Вільно з колькасцю рабочых і служачых у 1200 чалавек. На іншых шматлікіх фабрыках і заводах горада працуе па 100, 50, 30 і нават 20 чалавек. Вядома, што нашу ўвагу прыцягнуў мясцовы „гігант“. Чым жыве калектыў фабрыкі, як працуе выбраны рабочы камітэт, што хвалюе рабочых, служачых, інжынераў, тэхнікаў у гэтыя дні.

— Многа новага, многа цікавага, — гаворыць радыёманцёр, выбраны старшынёй рабочага камітэта таварыш Тэйтель Давід Якаўлевіч.

У маленькім пакоі фабрычнай канторы сядзелі члены рабочага камітэта: інжынер Шулькін, інжынер Розенштэйн і іншыя. Усе доўга і падрабязна расказвалі, як жылі пры ўладзе паноў і якія светлыя надзеі з'явіліся ў кожнага з прыходам Чырвонай Арміі. Іх расказы — гэта малюнак любога капіталістычнага прадпрыемства. Фабрыка выпускае 40 тысяч радыёпрыёмнікаў у год, валавая прадукцыя складае суму 14 мільёнаў злотых у год. Адзін апарат каштуе фабрыцы 200 злотых, а на рынку ён прадаваўся па 400—500 злотых і больш.

Велізарны прыбытак плыў у кішэню гаспадароў фабрыкі братоў Хволесаў і Левіна, а сярэдняя зарплата рабочага складала ў лепшым выпадку 3 злотых у дзень — на самае скуднае жыццё.

Далей — адпускі ў першым годзе па аднаму тыдню, сістэма штрафаў за малейшую правіннасць, адсутнасць усялякага абучэння і, нарэшце, тайная паліцыя на фабрыцы, якая выяўляла неблаганадзейных, выкідвала на вуліцу або ў турмы. Падаўлялася ўсялякае свабоднае слова, слова праўды. Расла нянавісць к панскаму рэжыму і на фабрыцы ўспыхвалі забастоўкі. Самай буйнай была дзесяцідзённая забастоўка ў 1934 годзе, але пасля зноў пачыналіся праследванні рабочых...

Але вось на гарызонце згусціліся хмары і браты Хволесы паспяшылі рэтыравацца. Прыйшла Чырвоная Армія і кампаньён Левін пакінуў фабрыку на волю лёсу. Рабочыя, служачыя, інжынеры і тэхнікі рашылі ўзяць кіраўніцтва ўсёй гаспадарчай дзейнасцю і вытворчым працэсам у свае рукі. 26 верасня быў выбран рабочы камітэт з 9 членаў і 11 кандыдатаў.

У камітэт увайшлі т.т. Тэйтель, слесары Марцынкін, Самсонік, Чаускі, бухгалтары Вайнштэйн, Флакс, радыёманцёр Пірцер. Словам у склад рабочага камітэта ўвайшлі прадстаўнікі ўсіх цэхаў і прафесій фабрыкі.

З ранніх і да позняга вечара члены рабочага камітэта знаходзяцца на фабрыцы. У іх столькі вялікіх і важных спраў. Сваю работу рабочы камітэт пачаў з арганізацыі дружыны па ахове прадпрыемства. Усякія могуць быць выпадковасці і таму трэба зорка ахоўваць народнае дабро. У дружыну ўжо ўступіла 60 чалавек. Яны па чарзе дзяжураць круглыя суткі, зорка ахоўваюць маемасць, склады, памяшканні.

Затым самае вялікае пытанне для камітэта — гэта пуск фабрыкі ў работу. Тут рабочы камітэт наткнуўся на вялікія цяжкасці, галоўная з якіх малы запас сыравіны. Але ўсё-ж такі рабочы камітэт рашыў ажывіць вытворчасць прадпрыемства. Зараз працуюць ужо цэхі па настройцы радыёапаратаў, механічны і сталярны цэхі. Сам калектыў думае зараз над тым, каб фабрыка жыла паўнакроўным жыццём і гэта ўжо прыемна. Так, самі рабочыя прапанавалі, каб пакуль-што асобныя цэхі пераключыць на вытворчасць іншай прадукцыі. Рабочы камітэт сабіраецца абмеркаваць мэтазгоднасць гэтай прапановы.

Рабочы камітэт правёў некалькі сходаў рабочых, асноўнай задачай каторых з'яўлялася сплачэнне калектыва, арганізуючы ўчот рабочых. Справа ў тым, што многія рабочыя асталіся зараз беспрацоўнымі. Сярод рабочых праведзена растлумачальная работа аб тым, што як толькі фабрыка атрымае сыравіну, усе яны стануць каля машын і станкоў і пачнуць энергічна працаваць. Мы гутарылі з некаторымі беспрацоўнымі. Паражае іх бадзёры настрой, іх аптымізм.

— Мы ведаем, — заявілі яны, — што нам засталося менш чакаць, што зусім скора мы забудзем, — што была такая хвароба - беспрацоўе, бо ў Совецкай краіне няма і не можа быць беспрацоўя.

Штодзённа засядае рабочы камітэт. У дзелавой, таварыскай абстаноўцы абгаварваюцца злабадзённыя пытанні. На фабрыцы, напрыклад, накапілася многа гатовай прадукцыі. Парашылі арганізаваць продаж і з прыбытку выдаць беспрацоўным рабочым, у якасці аванса, аднаразовую дапамогу, з тым, каб яны звярнулі грошы пасля, калі стануць працаваць.

Круг дзейнасці незвычайна шырокі, сотні рабочых прыходзяць у свой камітэт. Новыя запатрабаванні з'явіліся ў іх. Новыя, зусім новыя патрэбы, народжаныя прыходам у горад Вільно Чырвонай Арміі. Рабочыя цікавяцца, ці будзе адкрыт клуб, агульна - адукацыйныя і тэхнічныя курсы... Рабочы камітэт па настаянню рабочых звярнуўся ў Часовае Упраўленне, каб арганізаваць на фабрыцы лекцыі аб поспехах СССР. Былі арганізаваны калектыўныя наведванні выступленняў ансамбля Чырвонаармейскай песні і пляскі. Многія ішлі глядзець кінокарціну „Человек с ружьём“.

Так, самі рабочыя ў гэтыя дні праходзяць выдатную школу, набываюць вопыт кіраўніцтва многагранным жыццём прадпрыемства, пераконваюцца на практыцы, што могуць самі кіраваць, будаваць і распараджацца сваім лёсам.

Н. Грозаў.

Брацкая сустрэча

Па-над Нёмнам-ракой спазаранку
Устае сівагрывы туман...
Ад магутнага рокату танкаў
Уцякае збянтэжаны пан.

Галасілі званы на званіцах,
Бегла шляхта наўцёк без дарог,
І у роспачы падала ніцма,
Каб ёй бог ваяваць дапамог,

Ды дарма, не збылося жаданне,
Пан ратуецца сцежкаю вузкай.
Занімалі мы сонечным раннем
Родны горад зямлі беларускай.

Вышлі людзі, смяюцца, вясёлы,
Абнімаюць як родных братоў.
Аб'яднала нас зноў, назаўсёды
Спокан веку радзімая кроў.

Цяжка выказаць радасць жывую —
Бяццам свята у кожнай хаце.
Абдымае бабульку сівую
Наш баец, нібы родную маці.

Дзед сівы з перамучаным тварам
(Бізуноў панскіх зведаў ён многа),
Як з раўнёй гаварыў з камісарам,
Паказаўшы наперад дарогу.

Быў вясёлым у нас адпачынак:
На прывале забыт пераход.
І прыгожыя вочы дзяўчыны
Праважалі байца у паход.

Па-над Нёмнам-ракой спазаранку
Устае сівагрывы туман...
Ад магутнага рокату танкаў
Уцякае збянтэжаны пан.

П. В. Быкоўскі.

3.X—Вільно.

—:::—

Вольная песня

Мы стэпам шырокім, густымі лясамі
Па бурнаму моры, па гладзі рачной
Плывём і шагаем, як пташкі лятаем,
Гардзяся свабоднай краінай сваёй.

Куды-б не прыйшлі мы, каго-б не пазналі,
Мы кожнаму радасць сваю аддаём.
І нават тады, калі ногі зболелі
Гарыць наша пляска свабодным агнём.

Свабодную песняй свабоднай краіны
Звіні, наша моладасць, звонам вясны,
Народ Беларусі і Украіны
Да вольнага жыцця і шчасця заві

І. Слуцкер.
Удзельнік ансамбля танца СССР

Пераклаў Л. Стоцк

Прадкастрычніцкае соцыялістычнае спаборніцтва

Заклік Главы Совецкага Урада таварыша Молатава — чэсна і самааддана працаваць і тым самым аказаць дапамогу Чырвонай Арміі — выклікаў велізарны працоўны ўздым у нашай краіне.

Натхнёныя гераічнымі перамогамі Чырвонай Арміі на баявых франтах Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі, палкія патрыёты соцыялістычнай бацькаўшчыны, стаханаўцы прамысловасці і сельскай гаспадаркі ўдзесяцяраюць энергію і дабіваюцца выдатных вытворчых поспехаў. Адказваючы справай на заклік таварыша Молатава, стаханаўцы і ўдарнікі многіх прадпрыемстваў пераходзяць на многастаночнае абслугоўванне, вывучаюць 2—3 новыя прафесіі. Гэты выдатны стаханаўскі пачын, як нельга лепш, красамоўна і пераканаўча гаворыць аб той невычарпальнай гарачай любві совецкага народа да Чырвонай Арміі, да сваей мацеры — радзімы, да вялікай Партыі Большэвікоў, да мудрага бацькі свайго — таварыша Сталіна.

Набліжаецца XXII гадавіна Вялікай Кастрычніцкай Соцыялістычнай Рэволюцыі. Рыхтуючыся да гэтага вялікага свята працоўных, перадавы калектыў сталіцы — ініцыятар соцыялістычнага спаборніцтва імені гістарычнага XVIII з'езда ВКП(б) і за тым імені 3-й Сталінскай пяцігодкі — калектыў рабочых і служачых маскоўскага станкабудаўнічага ордэна Леніна завода „Красный Пролетарый“ звярнуўся з пісьмом да ўсіх працоўных, у якім заклікае іх азнаменаваць XXII-ю гадавіну Вялікай Кастрычніцкай Соцыялістычнай Рэволюцыі новымі перамогамі, дастойнымі нашай доблеснай Чырвонай Арміі, дастойнымі нашай Вялікай Партыі Леніна-Сталіна.

Калектыў Чырвона-пролетарцаў бярэ на сябе абавязацельствы з меншай колькасцю людзей не толькі выконваць, але і перавыконваць праграму чацвертага квартала, даць краіне звыш плана сто станкоў, значна больш магутных, чым выпускаўшыяся да гэтага часу.

Чырвона - пролетарцы абавязваюцца:

— Да канца года знізіць сабекошт прадукцыі на 8 процантаў пры планавым заданні 6.3 процанта;

— Шляхам няўхільнага росту стаханаўскіх радоў, перадаючы лепшы вопыт работы ў стаханаўскіх школах, шляхам выхавання маладых рабочых, якія нядаўна прыйшлі на завод, шляхам шырокага укаранення вынаходніцкіх і рацыяналізатарскіх прапаноў і далейшага паляпшэння тэхналагічнага працэса, — узняць галавую прадукцыйнасць працы на 16 процантаў супроць 11 процантаў па плану.

Улічваючы рост патрэбнасці соцыялістычнай прамысловасці ў рабочай сіле і неабходнасць пашырыць прымяненне жаночай працы на прадпрыемствах, чырвона-пролетарцы абавязваюцца ў чацвертым квартале прыняць на завод не менш 100 жанчын, падрыхтаваўшы з іх работніц высокай кваліфікацыі.

Звяртаючыся да калгаснікаў і калгасніц, чырвона-пролетарцы заклікаюць:

— Шырока разгортвайце спаборніцтва раёна з раёнам, калгаса з калгасам, брыгады з брыгадай за лепшае ўкараненне перадавога вопыту Усесаюзнай сельска-гаспадарчай выстаўкі, за ўсямернае ўмацаванне грамадскай калгаснай вытворчасці, за развіццё грамадскай жывёлагадоўлі, за выдатнае праводзенне асенніх работ у сельскай гаспадарцы.

Гарачы заклік перадавікоў соцыялістычнага спаборніцтва безумоўна сустрэне самы шырокі водгук сярод калектываў усіх прадпрыемстваў, калгасаў і соўгасаў краіны. Жадаючы ўсямерна ўмацаваць магутнасць сваёй радзімы, змагаючыся за далейшы рост дабрабыту ўсяго совецкага народа, рабочыя, калгаснікі, совецкія інтэлігенты пад сцягам прадкастрычніцкага соцспаборніцтва даб'юцца новых вытворчых перамог.

Адказвайце справай на заклік чырвонапролетарцаў! Уключайцеся ў прадкастрычніцкае соцыялістычнае спаборніцтва! Прымайце канкрэтныя абавязацельствы! Па-большэвіцку змагайцеся за іх выкананне!

—:::—

Сяляне сяла Сумань

Прасторныя землі сяла Сумань. Багатыя лясы, сочныя лугі, азёры поўны рыб — усё гэта ўладаўна належала не народу, не сялянам, а князю Радзівілу. Лепшыя землі забраў ён сабе. На 440 сялянскіх двароў прыходзілася ўсяго 600 гектараў пахатнай зямлі. Многа было беззямельных. Лясы, якія раскінуліся на 26 тысячах гектараў належалі таксама князю Радзівілу.

Нага селяніна не смела ступаць сюды. За гэта каралі смяротнымі пабоямі, растрэльвалі з дробавікоў, травілі гончымі сабакамі. У сяле жывуць толькі украінцы, але школа тут была польская.

Усё сяло было пад ботам князя і яго падручных. Усе яны жорстка здзекваліся над народам. Нават за спачуванне рэвалюцыянерам, за малейшае праяўленне любві к Совецкаму Саюзу, жорстка каралі, кідалі ў турмы.

5 год пакутваў у турме селянін Варфаламей Сішчук, 2 годы цярпеў катаванне селянін Павел Галаз. Настаў час расплаты за здзекі і гвалтаванне. Чырвоная Армія прынесла народу Заходняй Украіны свабоду, выгнала шляхту.

Мы ніколі не забудзем братэрскую дапамогу совецкага народа — гаворыць селянін сяла Сумань тав. Гламазда, — цяпер няма больш разнузданай улады Радзівіла. Шчаслівае жыццё прынеслі нам доблесныя сыны Краіны Советаў.

Суманскія сяляне актыўна дапамагалі часцям Чырвонай Арміі граміць польскую шляхту, добраахвотна запісваліся ў сельскія дружыны міліцыі, каб са зброяй у руках абараняць новае мірнае шчаслівае жыццё. У першыя-ж дні уступлення часцей Чырвонай Арміі сяляне раззброілі банду польскіх афіцэраў, якая хавалася ў лесе.

Сход сялян аднадушна выбраў камітэт, які праводзіць вялікую работу.

У сяле Сумань пасля доўгіх год разгулу панскага тэрору, закіпела грамадскае жыццё. Адкрываецца украінская школа. Дзеці сялян будуць вучыцца на роднай мове.

На суманскім лесапільным заводзе рабочыя па новаму арганізуюць вытворчасць. Завод работае на поўную магутнасць. Ён ужо адправіў нямала лесаматэрыялаў для абнаўлення дамоў і прадпрыемстваў бліжэйшых гарадоў.

—:::—

Першыя дні вучобы на роднай мове

ЛУЦК, Заходняя Украіна (ТАСС). Як толькі горад Луцк быў вызвален ад польскай шляхты, дырэктар 7-ай пачатковай школы Падгускі паспяшыў у школу. Разам з ім пайшло і многа вучняў. Усе яны былі здзіўлены убачаным. Вокны былі разбіты, ўсюды — на падлозе і на сценах — жахлівая гразь, парты і сталы звалены ў кучу, карты і кнігі разарваны, усё папсавана, растоптана.

Такавы вынікі гаспадарнічаўшых у школе польскіх афіцэраў. Тут расквартэравалі польскую воінскую часць. Школа была ператворана ў казармы. Настаўнікі школы разам з вучнямі адразу ўзяліся за навядзенне парадка. Выкладчыкі жадалі хутчэй пачаць работу ў школе, вучні гарэлі жаданнем вучыцца. Усе класы былі ачышчаны ад смецця і гразі, старанна вымыты падлогі, дзверы, вокны, растаўлены парты. На відным месцы настаўнікі і вучні з любоўю павесілі партрэт таварыша Сталіна. Настаўнік Падгускі, паказваючы на партрэт сказаў: „Вось той вялікі чалавек, які даў свабоду нашаму народу. Ён вучыць нас быць такімі-ж адважнымі сынамі народа, як мужныя воіны Чырвонай Арміі, якія нас вызвалілі“.

У школе работа ідзе па-новаму. Вялікая ўвага ўдзяляецца дасканалым навукам, вывучэнню гісторыі вялікага Совецкага Саюза.

Ва ўсіх школах Луцка ўведзены новыя дысцыпліны: граматазнаўства, дзяржаўны лад СССР. Настаўнікі з вялікім уздымам выкладаюць вучням Ленінска-Сталінскую нацыянальную палітыку.

Дзеці рабочых, сялян і служачых свабоднай Заходняй Украіны ўпершыню атрымалі магчымасць вучыцца на сваёй роднай мове.

Адкрыта дарога да шчаслівага жыцця

Цяжкім было жыццё сялян, рабочых і працоўнай інтэлігенцыі ў быўшай панскай Польшчы. Два мільёны беспрацоўных у гарадах, мільёны ў вёсцы! А тыя, якія імелі работу, павінны былі жыць на вельмі нізкай зарплаце, працуючы часта толькі па некалькі месяцаў у год. Урад, ахоўваючы інтарэсы памешчыкаў і капіталістаў, мала ўвагі ўдзяляў жыццю і патрэбам працоўнага насельніцтва. Знадворны блеск і мішура больш цікавілі панскую Польшчу, чым халоднае і галоднае жыццё мільёнаў працоўных.

Прыгнечанне нацыянальных меншасцей было першай задачай панскага ўрада. Адпаведна гэтаму розныя былі і адносіны польскага ўрада да розных групаў насельніцтва і нават да розных акругаў быўшай польскай дзяржавы.

Той, хто быў знаком з афіцыяльным урадавым друкам, часта сустракаў тэрміналогію: Польшча «А» і Польшча «Б».

Да Польшчы «А» належалі цэнтральныя і заходнія ваяводствы (акругі). Гэта былі акругі, якім польскі ўрад аказваў максімум сваёй фінансавай і эканамічнай падтрымкі.

Польшча «Б», — як называлі ўсходнія акраіны Польшчы, гэта знач. Заходняя Беларусь і Зах. Украіна, — была ўнутранай калоніяй, адкуль высмоктвалі ўсе сокі і куды нічога не давалі.

Ва ўсіх эканамічных планах Заходняя Беларусь і Зах. Украіна аставаліся на апошнім месцы. Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну паланізаваў польскі ўрад чыноўнікамі і паліцэйскімі, якія прывазіліся сюды з заходніх і цэнтральных акруг Польшчы. Адстаўных польскіх афіцэраў перавозілі сюды, надзялялі зямлёй і даручалі ім абараняць тут інтарэсы панства.

Нямала бед нацярпелася беларускае і ўкраінскае сялянства з боку гэтых, так званых „асаднікаў“.

Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна закованы былі ў ланцугі не толькі нацыянальнага, але і эканамічнага ўціску. Урад нічога не рабіў для развіцця Заходняй Украіны і Зах. Беларусі, а наадварот забараняў і тармазіў кожны крок уперад па шляху развіцця ўсходніх акраін быўшай Польшчы.

Невясёлым было жыццё працоўнага насельніцтва пад панскімі ботамі. Селянін карміўся бульбай, якая падавалася на стол тры разы ў дзень. Цукар, мяса, карасіна і нават запалкі вельмі рэдка можна было ўбачыць у сялянскай хаце.

Некалькі год таму назад селянін у адной з украінскіх вёсак зрабіў вельмі характэрнае вынаходства: ён сканструіраваў машынку, якая дзеліць адну запалку на 4 часткі.

Заходняя Беларусь і Зах. Украіна ў параўнанні з іншымі акругамі Польшчы, па віне польскага ўрада, былі асуджаны на галечу і эканамічную адсталасць.

На шчасце прыход Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі ў Зах. Беларусь і Заходнюю Украіну палажыў канец парабашчэнню краіны і адкрыў для народаў нашай беднай зямлі магчымасць светлага жыцця ў сям'і народаў Вялікага Совецкага Саюза.

І. Левін.

Першыя крокі работы Рабочай Гвардыі

Старыя будынкі польскіх камісарыятаў запульсавалі новым жыццём, запоўніліся новымі людзьмі. Гаспадарамі тут сталі самі рабочыя і сяляне.

Новыя гаспадары наводзяць новыя парадкі. Зніклі так добра знаёмыя працоўным гумавыя палкі; зніклі кайданы, якімі скоўвалі працоўных. Замест чужых нам служак капітала, мы бачым рабочых, інтэлігентаў. І дух стаў другі і адносіны сталі іншыя.

Вось некалькі сцэнак з жыцця 3-га батальёна:

I.

Дажджлівая восеньская ноч. На вузкай, маленькай вуліцы цішыня. Асцярожна рухаюцца цёмныя сілуэты. Гэта рабочыя гвардзейцы. Яны ахоўваюць безапаснасць і маёмасць працоўных. Нішто не ўскальзае ад іх зоркага вока.

II.

У габінеце камандзіра батальёна — нарада. Днём няма часу. Трэба збірацца ноччу.

3 гадзіны раніцы. Паседжанне ў поўным разгары. Усе ўважліва слухаюць, спрачаюцца, ніхто не думае аб сне — уперадзе многа работы і працаваць трэба не пакладаючы рук.

III.

У студзённую ноч караульны гвардзеец з'усёды на сваім пасту. Ён ахоўвае парадак, спакой горада.

Мы з вялікай радасцю выконваем свой доўг перад вольным народам.

3 батальён Рабочай Гвардыі
Эпштэйн Самуіл

—:::—

Культурна-бытавое абслугоўванне насельніцтва Беластока

Часовае Ўпраўленне горада правозіць рад мерапрыемстваў па арганізацыі культурна-бытавога абслугоўвання насельніцтва г. Беластока. Устаноўлены тэрміны работы прамтаварных магазінаў. У мэтах барацьбы са спекуляцыяй ва ўсіх крамах вывешаны прэйскуранты. З 1-га кастрычніка для працоўнага насельніцтва устаноўлена бясплатнае лячэнне ў бальніцах і амбулаторыях.

У бальніцах павялічваецца колькасць коек. Упершыню пры адной з бальніц адкрываецца дзіцячае аддзяленне. Часовае Ўпраўленне узяло на сваё ўтрыманне дом для прастарэлых.

Прынята таксама рашэнне адкрыць у горадзе 4 клуба для рабочых-тэкстыльшчыкаў, чыгуначнікаў і інш. Клубы абсталёўваюцца дарагой мэбляй, спецыяльны пакой адводзіцца пад бібліятэку.

(ТАСС).



У г. Вільно зараз гастраліруе аркестр беларускіх народных інструментаў.
На здымку: Група ўдзельнікаў аркестра.
фото Добравольскага

Аркестр беларускіх народных інструментаў у Вільно

У Вільно на гастролі прыехаў аркестр беларускіх народных інструментаў Дзяржаўнай філармоніі БССР пад кіраўніцтвам дырыжора Канстанціна Арсеньевіча Сімеонава. Разам з аркестрам прыехалі і прымаюць удзел у канцэртах заслужаная артыстка БССР Галіна, салістка Вялікага дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР — Мільчына і артыст Беларускага радыекамітэта Вастокаў.

У мінулым інструменты гэтага аркестра (цымбалы, дудкі, жалейкі, ліры) можна было чуваць толькі ў глухіх вёсках Беларусі. Царскія жандармы ўсяляк праследавалі культуру беларускага народа.

І толькі Вялікая пролетарская рэвалюцыя дала магчымасць свабодна пець на сваёй роднай мове, ускалыхнула крыніцы народных талантаў. Зараз мы бачым, якія музыкальныя таланты маюцца ў народзе, як музыкален беларускі народ, як ён любіць сваю песню.

За 20 год Савецкай улады шырока развілась музыкальная культура БССР. За гэты час створан тэатр оперы і балета, дзе працуе больш 800 чалавек артыстаў, створаны рэспубліканскія беларускі, рускі і яўрэйскі тэатры, дзесяткі тэатраў, якія спецыяльна абслугоўваюць соўгасы, калгасы. Дзяржаўная кансерваторыя штогод выпускае выдатных пяўцоў, музыкантаў. Дзяржаўная філармонія БССР мае ў сваім складзе сімфанічны аркестр (80 чалавек), харавую капэлу (90 чалавек), ансамбль беларускай народнай песні і пляскі (90 чалавек), выдатных салістаў-выканаўцаў, аркестр беларускіх народных інструментаў. Усё гэта з'яўляецца дзецішчам Вялікай кастрычніцкай рэвалюцыі. На ўтрыманне гэтых тэатральных і музыкальных устаноў наша дзяржава асігноўвае мільёны рублёў.

Нашы савецкія артысты не думаюць аб „чорным дні" і не працуюць на так званых „марках", з якіх, раней усяго, здымаў львіную долю антрэпрэнер, а потым жалкія грошы дзяліў паміж артыстаў.

Наш артыст атрымоўвае пастаянную зарабатную плату і думае толькі аб стварэнні правільнага вобраза, аб сваім штодзённым творчым росце.

Аркестр беларускіх народных інструментаў створан з асобных выканаўцаў. Аркестр выконвае не толькі беларускія народныя песні, ён выконвае сімфанічныя творы савецкіх кампазітараў-класікаў.

Пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі беларускі народ свабодна стварае мастацтва, нацыянальнае па форме і соцыялістычнае па зместу. Ён пяе аб сваім шчаслівым і радасным жыцці, аб лепшых стаханаўцах фабрык, заводаў і калгасных палёў. Сам народ стварае і пяе велічныя песні пра любімага і дарагога Сталіна, які даў народу свабоднае і заможнае жыццё.

Няма сумнення, што вызвалены народ Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ў адзінай сям'і народаў СССР таксама створыць народнае, радаснае мастацтва.

Г. З. Спектар.

Сяляне атрымалі зямлю

ПАСТАВЫ. Пастаўскі валасны сялянскі камітэт прыступіў да работы. Камітэт раздаў зямлю графа Пшэздецкага сялянам навакольных вёсак. Кожная гаспадарка ўзяла па 1—1,5 гектара зямлі.

Сяляне пачалі засяваць атрыманую зямлю азімымі. Арганізавалі ўборку бульбы. На ўборку бульбы камітэтам мабілізаваны былыя батракі маёнтка, беспрацоўныя рабочыя горада і сяляне.

Сялянскі камітэт стварае фонд для дапамогі беспрацоўным і батракам. Уся маёмасць маёнтка ўзята на ўчот і ахоўваецца камітэтам.

Камітэт пачаў раздачу сельскагаспадарчага інвентара, рагатай жывёлы, коней маёнтка батракам. Разданы ўжо коні і каровы, плугі, павозкі і іншы інвентар.

Днямі тры сям'і батракоў маёнтка графа перасяляны з сырых падвальных памяшканняў у светлыя добрыя панскія кватэры. Арганізавана дапамога сялянам у набыцці апалу.

Зараз валасны камітэт праводзіць сходы сялян па вёсках. На сходах сяляне з радасцю вітаюць сваю вызваліцельніцу — Чырвоную Армію, дзякуюць вялікаму правадыру таварышу Сталіну і маршалу Савецкага Саюза таварышу Варашылаву. У сваіх рэзалюцыях сяляне выказваюць гатоўнасць жыць і працаваць у дружнай брацкай сям'і народаў вялікага Савецкага Саюза.

Паспяхова праходзіць арганізацыя грамадзянскай гвардыі. Сяляне падаюць заявы аб залічэнні іх у гвардыю і міліцыю. У Паставах арганізавана грамадзянская гвардыя з 50 чалавек. К. В. Волкаў.

—:::—

70 тысяч кубічных метраў дроў для г. Вільна

У аддзеле паліва Часовага Упраўлення нам паведамілі, што горад будзе забяспечан палівам у дастатковай колькасці. У лясніцтвах Віленскай акругі загатоўлены дровы. Часовае Упраўленне прыняло неабходныя меры к таму, каб дастаўка дроў была наладжана хутка і добра.

Сёння ўжо прыбыло некалькі вагонаў дроў. Далейшыя транспарты ідуць. У бліжэйшы час у Вільно будзе дастаўлена сухапутным шляхам 70 тысяч кубаметраў дроў. Незалежна ад гэтага будзе таксама наладжана дастаўка дроў водным шляхам, па рацэ Віліі і яе прытоках.

Прыняты таксама меры к таму, каб прыватныя фірмы маглі даставіць раней закупленыя імі дровы.

Дровы, па меры іх паступлення ў горад, будуць прадавацца ўсім грамадзянам на прадуктовым карткам без ўсякіх дадатковых запісак Аддзела паліва па ўстаноўленым цэнам. Х Юдэлевіч.

Расказ лейтэнанта

Чырвоная Армія атрымала баявы загад свайго камандавання — перайсці граніцу і ўзяць пад сваю абарону жыццё і маёмасць працоўных Заходняй Беларусі. У часцях і падраздзяленнях небывалае ажыўленне. Байцы і камандзіры гатовы па слову сваей горача любімай радзімы на масавыя геройскія подвігі, на выкананне любога задання Савецкага Ураду.

Верасneўская ноч. Марудна паўзуць стрэлкі гадзінніка. Начная цемра пачынае рассейвацца раннімі прасветамі на ўсходзе.

Чырвоныя пагранічнікі, пакрыўшыя сябе славай пільнай аховай савецкіх рубяжоў, ачысцілі шлях. Дзе-нідзе пачуліся адзінокія стрэлы.

Дана каманда. Перадавыя часці рушылі ўперад. Магутнай, грознай лавінай танкаў і машын пайшлі часці Чырвонай Арміі.

Дарэмны былі спробы супраціўлення ворага. Ён знішчаўся меткім агнём нашых байцоў. Ашалелые афіцэры польскай арміі спрабавалі затрымаць імклівы рух уперад нашых чырвоных байцоў. Але ўсе гэтыя спробы не мелі ні малейшага поспеху.

З кожнай гадзінай часці Чырвонай Арміі паспяхова прасоўваліся усё далей і далей. Тысячы байцоў і камандзіраў гарэлі жаданнем праявіць сваё уменне і мужнасць у барацьбе з ворагам.

З невыказаемай радасцю сустракалі працоўныя вёсак і мястэчак Заходняй Беларусі нашы часці. Заўсёды яны акружалі нас любоўнай павагай і аказвалі нам дапамогу ў прасоўванні ўперад, на ворага. Насельніцтва ўказвала сцежкі і лепшыя дарогі, па якіх адступалі польскія паны.

У памяці чырвоных воінаў на усё жыццё застануцца баявыя эпізоды і любоўны прыём і сустрэчы іх беларускім народам у Заходняй Беларусі. Так сустракаць могуць толькі Чырвоную Армію, якая нясе шчасце і радасць, вольнае і светлае жыццё для ўсіх працоўных.

Мы усе, байцы і камандзіры доблеснай Чырвонай Арміі горды сазнаннем таго, што партыя і ўрад даручылі нам выкананне інтэрнацыянальнага абавязка. З іменем Сталіна, з імем сваёй цудоўнай радзімы на вуснах ішлі мы на ворага і высока пранеслі сцяг краіны соцыялізма, сцяг вызвалення працоўнага чалавецтва ад іга прыгнёту і парабашчэння. І таму нам не страшны ніякія перашкоды на сваім шляху, не страшны любы вораг. Пад гэтым сцягам Чырвоная Армія гатова разграміць усіх ворагаў краіны соцыялізма.

* * *

Вось і мястэчка Краснае. Тыпічнае мястэчка дарэвалюцыйнай Савецкай Беларусі, многія хаты развалены, прыліплі да самай зямлі.

Насельніцтва прыход нашых танкаў сустрэла з радасцю. Шпалерамі на вуліцы выстраіліся дарослыя і дзеці. Дзяўчаты для байцоў прыгатавалі букеты яркіх восеньскіх кветак. Завязалася гутарка.

— Ну, як справы, як жывіцё тут — пытаюцца чырвонаармейцы у абступіўшых машыну сялян і жыхароў мястэчка.

— Дзякуем, што вы прыйшлі. Хоць зараз дачакаліся. Дваццаць год марнелі мы, а не жылі.

— Дзе польскія паны, куды яны накіраваліся?

— Зараней яны адсюль уматаліся са сваімі цукеркамі. Відаць, пачулі сваю пагібель.

Тут-жа абступаюць нас сяляне і пачынаюць распытваць аб сваіх родзічах, знаёмых, якія жывуць у Савецкай Беларусі. Расказваем мы ім пра радаснае жыццё ў дружнай сям'і вялікага Савецкага Саюза.

— Нам аб гэтым тут іначай гаварылі. Але мы польскім панам не дужа верылі. Мы ведаем праўду аб тым светлым і радасным жыцці нашых братоў у Савецкай Беларусі.

— Таварыш камандзір, а ці можна запахаць панскую зямлю, пытае сівы старык.

— Ну, вядома, што можна. Колькі трэба, столькі аярыце і апрацоўвайце яе — адказалі мы.

Задаволены старык кіўнуў галавой, надзеў шапку і стаў уважліва слухаць нашу гутарку з сабраўшыміся. Потым мы даведаліся, што на гэты шлях прышлі сустракаць Чырвоную Армію сяляне навакольных вёсак.

Спраўныя баявыя машыны рокатам матораў напоўнілі мястэчка і мы пашлі далей. Сяляне расказвалі нам як трэба ехаць, гаварылі дзе і якія дарогі.

Каля адной вёскі нас сустрэла група сялян. Яны расказалі, што банда афіцэраў і польскіх салдат узброеная кулямётамі і вінтоўкамі захавалася на краю іх вёскі, у апушцы лесу. Яны выказалі сваё жаданне па ехаці і паказаць месца дзе распалажылася банда.

Група байцоў атрымала заданне пайсці і разброіць банду, а ў выпадку супраціўлення — знішчыць яе. За выкананне гэтага задання усе жадалі ўзяцца неадкладна.

Маленькая кучка афіцэраў была бяссільна перад магутнымі машынамі і агнём нашых танкаў. Усе яны здаліся без адзінага выстрала. Салдаты самі разброілі сваіх афіцэраў і прымусілі іх не адкрываць стральбы.

Доўга дзякавалі нам сяляне за гэта. Банда пагражала налётамі мірнаму насельніцтву і яна цяпер знішчана.

Недалёка ад Маладэчна ў лясу засела ўзброенная банда польскіх афіцэраў і салдат. Паблізу не было часцей Чырвонай Арміі. Банда займалася грабяжом у акаляючых вёсках.

Тады самі сяляне адной вёскі акружылі лес, раззброілі банду і затрымалі яе. У сараі, дзе хавалася банда, сяляне ўстанавілі ахову пакуль прыбылі часці Чырвонай Арміі. Усю зброю і затрыманых 60 афіцэраў і салдат польскай арміі сяляне здалі прыбыўшым у вёску чырвонаармейскім часцям.

* * *

На ўсім сваім шляху байцы і камандзіры Чырвонай Арміі паказвалі ўзоры геройства і самаадданасці. Прычым смеласць, геройства і адвага сталі масавай з'явай.

Цёпла і радасна сустракалі працоўныя Заходняй Беларусі сваю вызваліцельніцу — Рабоча-Сялянскую Чырвоную Армію. Яны ведалі, што толькі Чырвоная Армія, Савецкі Ўрад могуць вывесці народы Польшчы з злапалучнай імперыялістычнай вайны і вызваліць працоўных ад векавечных пакут і ад рабскага іга польскіх паноў.

Мы праходзім па мястэчку Смаргонь. На чырвоным палотнішчы праз усю вуліцу калышацца чырвоны транспарант са словамі прывітання вялікаму правадыру народаў таварышу Сталіну і Чырвонай Арміі.

Радасныя,ззяючыя шчасцем твары жыхароў сустракаюць стройныя шэрэнгі чырвоных воінаў.

Астаўляючы пазадзі мястэчкі, вёскі і гарады, мы набліжаліся да Вільно. Задача пастаўленая перад намі камандаваннем выканана.

На шляху да Вільно байцы і камандзіры са славай пранеслі чырвоны сцяг краіны соцыялізма. Яны паказалі сілу савецкага патрыётызма, уменне па майстэрску валодаць агнявой зброяй і быстра знішчаць ворага пры любых умовах.

Мы ўсе сыны сваёй радзімы свята ахоўваем і будзем ахоўваць вялікую справу партыі Леніна-Сталіна. Чырвоная Армія заўсёды стаяла і стаіць на ахове інтарэсаў працоўных, гатова змагацца за вызваленне працоўных з-пад гнёта рабства і эксплаатацыі.

Вялікая чэсць і слава насіць званне воіна такой непераможнай Чырвонай Арміі. Я рад і шчаслів, што мне радзіма даручыла такую зброю, даручыла выкананне такога абавязка як вызваленне працоўных Заходняй Беларусі з-пад іга польскіх паноў. Свой доўг я з чэсцю выканаю.

Лейтэнант Шведаў.

Уражанні з паездкі па Заходняй Беларусі

У сувязі з пачаткам вайны ў Еўропе наш урад выдаў загад аб мабілізацыі запаса, як начальніцкага склада, так і радавых для ўзмацнення заходняй граніцы, каб не быць уцягнутым у вайну знянацку.

У гэты час дырэкцыяй музыкальных калектываў былі запланіраваны нашы гастролі па Беларусі, але ў сувязі з ваенным становішчам у Еўропе і частковай мабілізацыяй на ўзмацненне нашых граніц дырэкцыя і ансамбль звярнуліся да палітупраўлення Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі з просьбай лічыць Ансамбль мабілізаваным і пакіраваць на абслугоўванне часцей Беларускай Асобай Ваеннай Акругі.

Палітупраўленне РСЧА выканала нашу просьбу і гэтым самым аказала нам давер'е і чесць быць у радах РСЧА БАВА.

14.IX.1939 г. Брыгадны камісар тав. Максімаў аб'явіў, што Ансамбль народнага танца СССР мабілізован для работы на вучэннях і 15.IX.39 г. быў накіраван у распараджэнне палітычнага ўпраўлення БАВА. Першае наша прадстаўленне было ў г. Смаленску для байцоў, камандзіраў, палітработнікаў і іх сямей. Канцэрт прайшоў з вялікім пад'ёмам і поспехам. Пасля канцэрта прадстаўнікі палітупраўлення віншавалі Ансамбль з пачаткам яго работы ў РСЧА і пажадалі далейшых поспехаў у абслугоўванні байцоў РСЧА, на што Ансамбль у асобе тав. Майсеева адказаў, што калі патрэбуецца, то Ансамбль народнага танца зможа абараняць свае прынцыпы так, як ён і танцуе.

Пасля сканчэння прывітанняў да ансамбля быў прымацован старшы інспектар палітупраўлення тав. Кручкін, як камісар нашага ансамбля.

16.IX.39 г. ўначы мы выехалі. Прыехаўшы ў Полацк, мы пачулі па радыё рашэнне ўрада, прамову тав. Молатава аб дапамозе і вызваленні брацкіх народаў Заходняй Беларусі і Зах. Украіны. Нельга перадаць словамі тую радасць, з якой сустрэў ансамбль рашэнне ўрада. Тут-жа адбыўся мітынг, на якім артысты ансамбля звярнуліся з просьбай да кіраўніцтва ансамбля хадатайнічаць перад партыяй і ўрадам аб дазволе на выезд на франтавую паласу дзейнічаючай арміі. Тут-жа 16 чалавек падалі заявы аб прыёме іх у партыю і рад таварышоў выказаў сваё жаданне ўступіць у шэрагі РСЧА, каб выступіць на вызваленне брацкіх народаў Заходняй Беларусі і Зах. Украіны. Даўшы два канцэрты ў Полацку, мы атрымалі радасную вестку аб дазволе на выезд у Заходнюю Беларусь. Гэтай-жа ноччу мы выехалі на граніцу ў мястэчка Глыбокае. Па дарозе мы давалі выступленні і арганізоўвалі гутаркі з сялянамі. Нашы сустрэчы з насельніцтвам Зах. Беларусі праходзілі з вялікім захапленнем. Сяляне расказвалі нам страшныя небыліцы аб Савецкім Саюзе, якія яны чулі пад гнётам польскіх паноў. Яны пыталіся, напрыклад, ці праўда, што старыкоў ад 50 год у нас растрэльваюць, а ўсе жанчыны носяць зялёныя гімнасцёркі, як і мужчыны. Яны таксама пыталіся ці не будуць іх цяпер зганяць жыць разам з каровамі і коньмі.

Сяляне расказвалі нам аб нячалавечнай эксплаатацыі іх панамі і польскай шляхтай.

У Глыбокім намі быў дан канцэрт для насельніцтва, на які з'ехаліся сяляне за 25 кіламетраў.

Тут нам яўрэйскае насельніцтва расказвала аб рабаўніцтве і здзеках над імі з боку польскіх уладаў. Яўрэям забаранялася наведваць тэатр, вучыцца ў школах. Нават хадзіць ім дазвалялася толькі ў пэўных месцах.

Цікава адзначыць, што чалавек, які меў зажыгалку, павінен быў плаціць падатак, а не зарэгістрыраваўшы сваю зажыгалку плаціў штраф.

Усё гэта гаворыць аб чудовішчных і зверскіх адносінах да беднага насельніцтва з боку капіталістаў.

21.IX наша калона рушылася далей у глыб Зах. Беларусі, у гор. Паставы. Зноў загрымелі нашы баявыя совецкія песні.

У г. Пастава мы далі два канцэрты: адзін для байцоў дзейнічаючай арміі, другі — для насельніцтва. Зноў нашы канцэрты ператварыліся ў гарачую, дружную сустрэчу прадстаўнікоў совецкага мастацтва з байцамі РСЧА з вызваленымі народамі Заходняй Беларусі. Заўзятымі крыкамі і незмаўкаючымі апладысментамі сустракалі працоўныя кожны танец. Пасля канцэрта мы пелі нашы песні і, к нашаму захапленню і здзіўленню, іх падхаплялі слухачы-працоўныя беларусы, яўрэі і палякі. Яны прасілі нас праспяваць песню „Танкісты", "Комсамольская", „Песня о родине" і інш.

Пасля мы прыехалі ў Свенцяны. Мы сустракалі чырвонаармейцаў — сваіх таварышаў на рабоце. Нам было прыемна паціскаць ім руку, абняць і адчуць, што мы ідзем разам з імі. Яны нясуць вызваленне працоўнаму народу Заходняй Беларусі і Зах. Украіны, а мы нясем культуру і росквіт совецкага мастацтва. У Свенцянах мы далі за два дні восем канцэртаў для байцоў РСЧА, грамадзянскага насельніцтва і школьнікаў, з якімі мы вялі размовы аб вучобе і культуры ў совецкай краіне. Трэба было бачыць з якой прагнасцю дзеці слухалі нас; і мы адчувалі, як гэта маладое пакаленне калечылася існаваўшым у Польшчы ладам. Іх рыхтавалі на карысць капіталізма і духавенства. Ім убілі ў галаву, што ўсё, што стварыла прырода, навука — гэта бог.

Пасля доўгіх з імі гутарак мы адчувалі, што гэта моладзь усё такі бачыць праўду і што, не гледзячы на ўсе папыткі панства і духавенства зацямніць іх сазнанне, большавіцкая праўда знаходзіць у іх мазгах добрую глебу.

І верыцца, што ў хуткім часе гэта моладзь стане ў шэрагі вольнай совецкай моладзі.

28.IX.39 г. мы прыехалі ў Вільно. У гэты-ж дзень мы давалі ў Польскім тэатры канцэрты для байцоў-танкістаў РСЧА і для грамадзянскага насельніцтва.

Была наладжана сустрэча з польскімі акторамі. На канцэрце выступіў дырэктар польскай трупы Леопольд Кілчноўскі. Ён гаварыў, што ён сам і ўвесь калектыў яго трупы нічога падобнага не бачыў. Яго словы пацвярдзіліся тым, што ўсе нашы танцы суправаджаліся авацыямі. Гэта гаворыць за тое, што мудрая сталінская палітыка апраўдваецца на практыцы, чаго не могуць адмаўляць ёй і капіталістычныя краіны.

Дні, праведзеныя намі ў Зах. Беларусі, навучылі нас многаму. Яны памаглі нам вырасці ў агітатараў большэвіцкай праўды. Усе без выключэння артысты ансамбля ў гэтыя дні праводзілі з насельніцтвам гарачыя гутаркі аб шчаслівым жыцці ў нашай краіне, аб Сталінскай Канстытуцыі, аб Чырвонай Арміі, аб любімым правадыру сусветнага пролетарыята таварышу Сталіне. Выяжджаючы далей па свайму маршруту, мы будзем з гонарам і вялікім энтузіязмам нясці ў масы сталінскае мастацтва, сталінскую праўду. Мы будзем нясці братам Зах. Беларусі бодрасць і ўпэўненасць у перамозе. Артысты ансамбля народнага танца СССР:

Іўкіна
ордэнаносец Арсенеў
Шапавалаў.

Выпадак на вуліцы

Аб прыветнасці байцоў і камандзіраў Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі сярод віленчан ужо зложыліся легенды.

Днямі праходзіўшыя Легіёновай вуліцай людзі былі сведкамі гэткага выпадку:

Па тратуары, кульгаючы на адну нагу ішла старая бабулька. Нясла яна поўнае вядро бульбы. Старэнькай ноша была не па сіле. Яна праз кожныя колькі шагоў затрымвалася, цяжка дыхаючы.

У гэты час па вуліцы праяжджалі камандзіры Чырвонай Арміі. Камандзіры не засталіся рэўнадушнымі да мукаў старушкі. Аўтомашына астанавілася каля тратуара. Маладыя камандзіры ўзялі бабульку з вядром у машыну, падвязлі яе дамоў.

На ўсіх прысутных гэта зрабіла глыбока-хвалюючае ўражанне.

ЗА РУБЯЖОМ

Ваенны агляд газеты „Тан"

БРУСЕЛЬ, 3 кастрычніка. (ТАСС). Французская газета „Тан" з 2-е кастрычніка, ў аглядзе ваенных аперацый на заходнім фронце, піша: „З пункту гледжання выключна стратэгічнага мы прыйшлі сёння да палажэння, дастаткова адрозніваючагася ад таго, што можна было разумна прадпалагаць некалькі тыдняў назад.

Пасля пачатку, поўнага абяцанняў, мы былі вымушаны прыпыніць нашы дзеянні у рэйнскай вобласці, таму што яны з'явіліся дзеяннямі, не маючымі прамой мэты, з прычыны быстрага разгрома польскай арміі. З таго часу нашай пазіцыяй з'яўляецца толькі стратэгічнае чаканне.

Але немцы ў сваю чаргу не спяшаюцца у цяперашні час прапачаваць нам генеральнае сражэнне. Яны вярнулі частку войск з Польшчы. Яны ўмацавалі запаснымі часцямі тылавыя пазіцыі ў Саарскай вобласці і Бадэне, каб быць гатовымі да ўсякіх магчымасцей. Але нідзе не відно масавых транспартаў, накіроўваючыхся да той ці іншай часці наш й граніцы або да граніц суседніх нейтральных дзяржаў. Не відаць таксама нідзе зоны вялікай концэнтрацыі войск, якая адна толькі магла-б даць нам не выклікаючае сумнення ўказанне аб маючым быць у хуткім часе наступленні.

Наадварот, часць нямецкіх палкоў, вярнуўшыхся з Польшчы, накіроўваецца ў свае гарнізоны, (ведама-ж, для папаўнення людзмі і матар'яламі). У прыватнасці, значная часць авіяцыйных злучэнняў была накіравана ў іх базы мірнага часу.

Словам, у цяперашні момант, калі не лічыць сутычак усялякай інтэнсіўнасці, якія адбываюцца на фронце паміж Мозэлем і Рэйнам, абнаружваецца, што аперацыі спынены. Уцягнутыя ў ваенныя дзеянні сілы немногалікія. Пераважаючыя большасць армейскіх карпусоў знаходзіцца ў рэзерве, будучы распалажанай уздоўж чыгунак і шасе і нават ва ўнутраных вобласцях. Колькі часу працягнецца гэта фаза нерухомасці? Толькі будучыня можа даць нам на гэта адказ"...

—:::—

„Ліітто" аб знешняй палітыцы СССР.

ХЕЛЬСІНКІ, 3 кастрыч. (ТАСС). Каментыруючы апошнія дыпламатычныя перагаворы ў Маскве, рад фінляндскіх газет адзначаюць каласальна вырасшую ролю СССР у міжнароднай палітыцы. Так газета „Ліітто" ў перадавым артыкуле заяўляе: „СССР у наступны час займае вельмі важнае становішча ў Еўропе. Совецкі Саюз не ізаліраван ад палітыкі вялікіх дзяржаваў, а наадварот, ён сур'ёзна ўплывае на ход падзей. Ключ вялікай палітыкі знаходзіцца ў руках Масквы". Газета падкрэслівае вельмі важную і рашаючую ролю СССР на Балтыйскім моры.

—o—

Налет кітайскіх самалётаў на Ханькоу

ЧУНЦЫН. 3 кастрычніка. (ТАСС) Агенцтва Юнайтэд Прэсс, спасылаючыся на звесткі з кітайскіх ваенных кругоў паведамляе, што сёння 6 кітайскіх бамбардыроўшчыкаў у суправаджэнні знішчальнікаў выляцелі ў сваю базу, размешчанай ў Заходнім Кітаі і скарыстаўшы добрае надвор'е, дасягнулі Ханькоў. Бамбардыроўцы быў падвергнут ханькоўскі аэрадром. Усе самалёты ў добрым становішчы звярнуліся на свае базы. Як кажуць сведкі, неадкладна пасля налёта на аэрадроме ўзнік пажар. Сведкі таксама перадаюць аб вялікіх разрушэннях, зробленых японскаму аэрадрому.

—:::—

Антываенныя настроі ў Японні

ЧУНЦЫН, 3 кастрычніка. (ТАСС). На фронце ў Паўночным Кітаі і ў прыватнасці ў правінцыі Шаньсі шырока распаўсюджваюцца апошнія антываенныя лістоўкі. Лістоўкі падпісаны антываенным саюзам японскіх салдат ураджэнцаў Токіо. Осака і Нагасакі.

На заходнім фронце

НЬЮ-ЁРК, 2 кастрычніка (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Юнайтэд Прэс з Рэміха (Люксембург) за германскай лініей фронта ў даліне ракі Мозель тысячы салдат і рабочых заняты на работах па заканчэнню будаўніцтва заходніх умацаванняў. Карэспандэнт указвае, што аб'ехаў 1 кастрычніка 80 міль уздоўж люксембургска-германскай граніцы, ён не чуў ніводнага выстрала. Мёртвая цішыня царыць цяпер і ў раёне Саарбрукена, дзе на працягу апошніх трох дзён не сціхала артылерыйская стральба.

Ад Шэнгена да Вессербілліга будаўніцтва заходніх умацаваннеў ужо закончана. Ад Вессербілліга да Валлендорфа ў сучасны момэнт ускоранымі тэмпамі ідзе будаўніцтва фартоў, бетонных кулямётных гнёзд, насыпей, перашкод і провалачных загараджэнняў. З люксембургскай граніцы карэспандэнт бачыў каля 30 фартоў, будаўніцтва каторых скрыта вядзецца за дзеравянымі пабудовамі.

ПАРЫЖ, 3 кастрычніка. (ТАСС). Агенцтва Гавас перадае афіцыяльнае камюніке, апублікаванае ў Парыжы ўвечары 2 кастрычніка:

„У раёнах на поўдзень ад Саарлуі і на ўсход ад ракі Саар мясцовыя атакі праціўніка былі адкінуты. У раёне на ўсход ад ракі Саар назіраецца артылерыйская страляніна праціўніка".

Агенцтва Гавас паведамляе па радыё, што ў рэзультаце паветраных сутычак, быўшых на заходнім фронце за апошнія суткі, збіта 5 германскіх і 3 французскіх самалёты. Экіпажу аднаго з французскіх самалётаў удалося выратавацца на парашутах.

ПАРЫЖ, 3 кастрычніка. (ТАСС). Агенцтва Гавас перадае камюніке аб ваенных дзеяннях, апублікаванае ў Парыжы раніцай 3 кастрычніка. У камюніке гаворыцца: „У працягу ночы назіралася вялікая актыўнасць патрулёў на розных участках фронта."

—:::—

Паведамленне камандавання германскага ваенна-марскога флота

БЕРЛІН, 3 кастрычніка (ТАСС). Камандаванне германскага ваенна-марскога флота апублікавала наступнае паведамленне: „30 верасня раніцай германская падводная лодка ў звычайнай форме патрабавала ад дацкага парахода „Вендіа", каб ён застанавіўся, таму што неабходна было ўстанавіць нацыянальнасць і характэр груза гэтага парахода. Параход прабаваў пазбегнуць агляду і скрыцца. Калі ўслед за гэтым германская падводная лодка затрымала параход, то апошні прабаваў пратараніць падводную лодку. У адказ на гэтыя яўна варожыя дзеянні германская падводная лодка прыбегла к узброеннай сіле. Параход „Вендіа" быў тарпедзіраван і затоплен. Астаўшыяся ў жывых члены каманды дацкага парахода былі падобраны германскай падводнай лодкай і перададзены на другі дацкі параход".

—:::—

Паведамленне вярхоўнага камандавання германскай арміі

БЕРЛІН, 3 кастрычніка. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне германскай арміі апублікавала наступнае паведамленне: „У працягу 2 кастрычніка германскія войскі прадаўжалі ўступленне ў Варшаву. Робіцца учот палонных і вялікай колькасьці ваенных матар'ялаў у Варшаве і Модліне. На захадзе мела месца нязначная артылерыйская страляніна. Адбываліся дзеянні авіяцыі.

Адказны рэдактар І. М. ОФЕНГЕИМ.

Адрас рэдакцыі і друкарні: вул. Епіскопа Бандурскага 4. Тэл. 79 і 99.